1 мая, 2 СТАР.

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

31 КАНАЛ

Анонс лепшых фільмаў на кожны дзень.

— Сыр — гэта цудоўны смак і карысныя ўласцівасці. Ён дае чалавеку энергію, сілу. Адным словам — карысная смаката! СТАР. 6

Пры вырошчванні агуркоў на звычайнай градцы яны заплятаюць усю зямлю, і таму збіраць іх вельмі і вельмі нязручна. Можна паспрабаваць падысці да справы больш творча. СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 КРАСАВІКА 2012 г. ПЯТНІЦА № 81 (27196) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«У ЕЎРАСАЮЗЕ ЗРАЗУМЕЛІ БЕСПЕРСПЕКТЫЎНАСЦЬ САНКЦЫЙ У АДНОСІНАХ ДА БЕЛАРУСІ»

Фота БЕЛТА.

Па існуючай ужо традыцыі Аляксандр Лукашэнка 26 красавіка праводзіць у чарнобыльскіх рэгіёнах. У другі дзень сваёй рабочай паездкі ў Магілёўскую вобласць Прэзідэнт Беларусі наведаў Быхаўскі раён.

Быхаўскі кансервава-агароднінасушыльны завод вырабляе вялікую колькасць кансерваванай натуральным спосабам прадукцыі з высакаякаснай сыравіны. Асноўныя партнёры на замежным рынку — Расія, Казахстан, Туркменістан, ЗША, Канада. У 2011 годзе завод атрымаў чыстага прыбытку ў суме Br4 млрд пры рэнтабельнасці продажаў 8,6 працэнта. Экспартавана прадукцыі на суму $2,2 млн.

У Еўрасаюзе зразумелі бесперспектыўнасць санкцый у адносінах да Беларусі, заявіў Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанні журналістаў. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Вось калі б еўрапейцы разумелі, што санкцыі дзейнічаюць і нас можна нахіліць у той бок, у які яны хочуць, вы думаеце, яны ад іх адмовіліся б? Ніколі. Яны нас душылі б, на калені ставілі, потым яшчэ закапалі б па калена ў зямлю, а можа і глыбей. Напэўна, зразумелі, што санкцыі — гэта шлях нікуды, гэта бесперспектыўна. Яны, напэўна, зразумелі, што Беларусь ім патрэбна».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў Беларусі было прынята рашэнне з больш умацаваных заходніх граніц перакінуць частку сіл на паўднёвы напрамак. «Цяпер мы ў асноўным кантралюем тыя пытанні, якія цікавяць Беларусь, і працуем у асноўным з кантролем на ўезд у краіну», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў: «Ужо сумежныя дзяржавы звярнуліся да нас: дапамажыце, вы ж практычна адкрылі граніцу. Але ў нас няма грошай. Так, я магу павялічыць колькасць мытных і пагранічных пастоў, але вы, калі ласка, нам заплаціце». Калі Беларусь аслабіла кантроль на выезд у Еўропу, на Захадзе атрымалі цэлую хвалю мігрантаў з Афганістана, Пакістана, Азіі, канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Я не гавару аб тых буйных эканамічных стратах, якія панясуць парты Балтыі. Не буду таіць: мы вядзём перагаворы з Расіяй, каб яны панізілі чыгуначныя тарыфы з тым, каб мы загрузілі іх порты на Балтыцы, яны былі б рады бачыць мільёны тон нашых грузаў». Прэзідэнт таксама сказаў аб тым, што Беларусь дамовілася з украінцамі аб павелічэнні аб'ёмаў паставак праз паўднёвыя парты. Ён рэзюмаваў: «Калі мы не патрэбны ў краінах ЕС, то мы будзем шукаць сваё шчасце далей». Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў: «Калі ЕС сёння гатовы без папярэдніх умоў, не нахіляючы нас налева, направа, з намі размаўляць па-чалавечы, то мы гатовы ў любы час вярнуцца па любых пытаннях за стол перагавораў. Мы не ястрабы, ястрабінай палітыкі ў Беларусі не было і не будзе. Таму мы гатовы садзіцца і абмяркоўваць любыя праблемы. Але будуць аказваць націск — мы будзем адказваць».

Для Беларусі вельмі важны візіт Прэзідэнта Туркменістана, які заўтра прыбывае ў Мінск, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. У ходзе перагавораў з кіраўніком Туркменістана плануецца абмеркаваць увесь комплекс двухбаковага супрацоўніцтва, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама падкрэсліў: «Магчыма, мы выйдзем на нейкія новыя тэмы. Але дай бог рэалізаваць тое, пра што мы раней дамаўляліся». Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Туркменістан з'яўляецца важным і перспектыўным партнёрам для Беларусі. У Туркменістана ёсць вялікія сродкі, але няма тых тэхналогій, якія ёсць, напрыклад, у Беларусі, ва Украіне, Расіі.

«Мы пачалі будаваць у іх калійны камбінат, і яны вельмі задаволены нашай работай. Мы прапанавалі будаваць аўтадарогі, жыллё, пастаўляць туды тэхніку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама нагадаў аб тым, што ёсць дамоўленасць з Прэзідэнтам Туркменістана сустракацца адзін раз у год-паўтара і кантраляваць, як рэалізуюцца дамоўленасці. СТАР. 2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАСЛАЎСКАЯ ПРАТОКА

НОВАЕ Ў ДЗЯРЖАЎНАЙ ЖЫЛЛЁВАЙ ПАЛІТЫЦЫ:

квадратны метр — за адну зарплату і празрысты рынак арэнднага жылля

Савет Міністраў Беларусі вынес на грамадскае абмеркаванне праект Канцэпцыі дзяржаўнай жыллёвай палітыкі на 2012—2015 гады. У праекце разглядаецца рашэнне жыллёвых праблем не толькі чаргавікоў (якім раней надавалася асаблівая ўвага), але і ўсіх катэгорый грамадзян. У гэтым дакументе змяшчаюцца адказы на многія пытанні: што будзе з ільготамі, чаргой, іпатэкай, арэндным жыллём, сістэмай будаўнічых зберажэнняў.

Асноўныя задачы Канцэпцыі — давесці долю індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва да 50% у агульным аб'ёме, наблізіць кошт квадратнага метра да сярэднямесячнай зарплаты беларусаў, стварыць празрысты рынак арэнднага жылля, максімальна ўцягваць у будаўніцтва ўласныя сродкі грамадзян.

Таксама плануецца, што да 2015 года перыяд чакання кватэры ў чарзе тых, хто мае патрэбу, для шматдзетных сем'яў зменшыцца да 3 гадоў (у Мінску — да 7 гадоў). Для вайскоўцаў і некаторых іншых сацыяльна прыярытэтных катэгорый гэты перыяд не павінен перавышаць 5 гадоў.

Як паведаміў на прэс-канферэнцыі **начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр ГОРВАЛЬ**, згодна з Указам Прэзідэнта № 184, грамадзян Беларусі, якія будуюць жыллё, **дакрэдытуюць на ранейшых умовах.** Гэтыя людзі, па яго словах, дабудуюць жыллё, і сродкі, атрыманыя імі, дапамогуць не толькі вырашыць іх жыллёвую праблему, але і дазволяць працягваць работы падрадным арганізацыям і забудоўшыкам, якія павінны ўвесці ў эксплуатацыю дамы ў адпаведнасці з тэрмінамі і планамі.

Праектам канцэпцыі прадугледжана, што **сістэма дзяржаўнага заказу ў будаўніцтве** будзе прызначана толькі для льготных катэгорый грамадзян. Гэты механізм запрацуе з 2013 года. Ільготнікі будуць цалкам вызвалены ад унясення аплаты на этапе будаўніцтва, і толькі атрымаўшы гатовае жыллё, пачнуць выплачваць крэдыт.

Ва ўрадзе абяцаюць, што ўжо сёлета запрацуе **іпатэка** (набыццё жылля ў крэдыт пад заклад самога набытага жылля). Прычым у іпатэку можна будзе не толькі будаваць, але і купляць жыллё на другасным рынку. Пры гэтым грамадзянам, якія бяруць іпатэку, абяцаюць падатковыя льготы.

Акрамя гэтага, канцэпцыя прадугледжвае і **сістэму будаўнічых зберажэнняў**. Як толькі чалавек назапашвае ў банку на рахунку 25—50% кошту кватэры, яму даюць крэдыт на астатнюю частку пад паніжаную працэнтную стаўку. Патанненюць крэдыты і для астатніх грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў: іх будуць даваць пад стаўку на 2% ніжэй, чым па камерцыйных крэдытах. Як лічаць ва ўрадзе, дзякуючы такім захадам у 2012—2015 гадах узрасце даступнасць жылля на другасным рынку. СТАР. 2

БЕЗ ЦІКАВАЙ ІНТЭРНЭТ-ВЕРСІІ Ў ДРУКАВАНЫХ СМІ НЯМА БУДУЧЫНІ

Такое меркаванне выказаў 26 красавіка намеснік міністра інфармацыі Беларусі Уладзімір Матусевіч на семінары для кіраўнікоў рэгіянальных друкаваных СМІ. Семінар адбыўся ў рамках XVI Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «СМІ ў Беларусі», якая праходзіць сумесна з XIX Міжнародным форумам па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «Tibo-2012», перадае БЕЛТА.

«Асваенне інтэрнэт-прасторы — вельмі актуальны і перспектыўны напрамак работы. У рэгіянальных СМІ краіны створаны свае інтэрнэт-сайты, сустракаецца даволі шмат добрых інтэрнэт-праектаў. Галоўная праблема — актуалізацыя існуючага інфармацыйнага кантэнту для таго, каб не змяншалася колькасць чытачоў і падпісчыкаў друкаваных версій выданняў і пры гэтым паступова павялічвалася колькасць карыстальнікаў інтэрнэт-рэсурсаў», — сказаў Уладзімір Матусевіч.

У ходзе семінара ўдзельнікі таксама звярнулі ўвагу на тэмы: «Інтэрнэт-СМІ і блогасфера — супрацоўніцтва і ўзаемапранікненне», «Сучасныя мабільныя рашэнні для друкаваных СМІ на базе смартфонаў. Прыклады і перспектывы». Галоўны рэдактар расійскага інфармацыйнага агенцтва «Росбалт» Мікалай Ульянаў адзначыў, што інтэрнэт-СМІ і блогасфера не з'яўляюцца канкурэнтамі, яны, хутчэй, саюзнікі, якія дапаўняюць адзін аднаго.

НА ВЫХАДНЫЯ — ДА ПЛЮС 29

Сёння ўдзень тэрыторыя нашай краіны трапіць у зону павышанага ціску, калі ў Беларусь завітае цёплае паветра з боку Міжземнага мора, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Удзень будзе ад плюс 19 на поўначы да 25 градусаў на поўдні краіны. Чарговую порцыю цёплага паветра прынясуць да нас з поўдня кантынента камфортныя вятры ў суботу і нядзелю. Захаваецца малавоблачнае без ападкаў сонечнае надвор'е. Раніцай месцамі слабы туман. Уначы ў гэтыя дні будзе 7—14 цяпла, удзень — ужо плюс 21—27, а ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях прыпячэ ажно да 29 градусаў.

І ў панядзелак на большасці тэрыторыі ападкаў не прагназуецца, толькі на поўначы Беларусі месцамі кароткачасовы дождж. Удзень — 15—22, на поўдні краіны 23—27 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

АПАДКІ СПЫНІЛІ РУХ

У сераду ўвечары ў Мінску неба зацягнулі хмары, а потым ударыў дождж...

У выніку з 18.30 да 20 гадзін выпала 6 міліметраў ападкаў (пры сярэднямесячнай норме 89 міліметраў). З-за гэтага ў горадзе на паўтары гадзіны спыніўся рух трамвайтаў (№№ 12, 22, 40) на скрыжаванні вуліц Карастаянавай і Арлоўскай, бульвары Шаўчэнкі. Для ліквідацыі наступстваў падтапленняў была задзейнічаная аварыйная брыгада УП «Рамаўтадар» Цэнтральнага раёна г. Мінска.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ліцэй БДУ аб'яўляе прыём навучэнцаў у 10 класы

Уступныя іспыты пройдуць **13 і 20 мая 2012 года.** Документы неабходна падаць да **8 мая 2012 г.** уключна. Без уступных іспытаў залічваюцца пераможцы рэспубліканскай алімпіяды па **фізіцы, матэматыцы, інфарматыцы, хіміі, біялогіі, гісторыі, грамадазнаўстве, рускай мове і літаратуры, беларускай мове і літаратуры.** Падчас навучання ў Ліцэі іншагароднім навучэнцам даецца інтэрнат.

Падрабязнасці на афіцыйным сайце Ліцэя БДУ: **http://www.lyceum.by**.

Тэлефоны для даведак: 226 01 12, 209 56 19.

ЛІЧБЫ ДНЯ

У Беларусі зацверджаны новыя памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў (МСБ) для васьмі сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва.

Так, сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек з 1 мая па 31 ліпеня гэтага года складае Br1 млн 171 тыс. 590 у разліку на месяц. Гэта на 6,4% перавышае нарматыў, які дзейнічаў з 1 лютага па 30 красавіка 2012 года.

Зацверджаны таксама сярэднедушавыя мінімальныя спажывецкія бюджэты маладой сям'і з трох чалавек — Br1 млн 236 тыс. 640, працаздольнага насельніцтва — Br1 млн 484 тыс. 580, пенсіянераў — Br1 млн 160 тыс. 190, студэнтаў — Br1 млн 163 тыс. 860, дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — Br921 тыс. 830, дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў — Br1 млн 108 тыс. 220, дзяцей ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў — Br1 млн 323 тыс. 510.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 23°
Віцебск	+ 21°
Гомель	+ 23°
Гродна	+ 23°
Магілёў	+ 21°
Мінск	+ 21°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.04.2012 г.

Долар ЗША	8020,00 ▲
Еўра	10620,00 ▲
Рас. руб.	274,00 ▲
Укр. грыўня	998,01 ▲

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЧАВЕС ЗАВЯРШЫЎ КУРС ЛЯЧЭННЯ І ВЯРНУЎСЯ Ў КАРАКАС

Прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес завяршыў чарговы курс лячэння на Кубе і вярнуўся ў краіну, паведамілі ў чацвер лацінаамерыканскія СМІ. «Старшыня Дзяржсавета і Савета Міністраў Кубы Рауль Кастра праводзіў на радзіму ўвечары ў сераду прэзідэнта Венесуэлы Уга Чавеса», — паведаміла ў чацвер газета «Гранма». Сам Чавес, ужо знаходзячыся ў самалёце, напісаў у сваім акаўнце ў Twitter, што вязе ў Венесуэлу «прывітанні ад Фідэля, Рауля і ўсёй Кубы». Пазней венесуэльскія СМІ паведамілі, што ў ноч на чацвер прэзідэнт вярнуўся ў краіну. Прэзідэнцкія выбары ў Венесуэле намечаны на 7 кастрычніка. На пасаду кіраўніка дзяржавы прэтэндуе сам Чавес, які знаходзіцца ва ўладзе з 1999 года, і Энрыке Капрылес, вылучаны ў лютым у якасці адзінага кандыдата ад венесуэльскай апазіцыі.

САРКАЗІ АДМОВІЎСЯ АД ЗДЗЕЛАК З НАЦЫЯНАЛІСТАМІ

Прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі, які ўдзельнічае ў выбарах кіраўніка дзяржавы, адмовіўся ад палітычных здзелак з правай нацыяналістычнай партыяй Мары Ле Пэна «Нацыянальны фронт». Як заявіў Сарказі ў эфіры радыёстанцыі «Франс Інфа», ён не мае намеру заключаць з нацыяналістамі ніякіх пагадненняў і не будзе запрашаць іх ва ўрад у выпадку сваёй перамогі на выбарах. Але пры гэтым палітычны лідар заклікаў не «дэманізаваць» прыхільнікаў «Нацыянальнага фронту». Сарказі запэўніў, што будзе мець зносіны з тымі, хто падтрымаў Ле Пэна ў першым туры прэзідэнцкіх выбараў. Ён адзначыў, што не згодны з пазіцыяй свайго асноўнага суперніка па прэзідэнцкай гонцы Франсуа Аланда, які зганіў тых, хто прагаласаваў за лідара «Нацыянальнага фронту». Раней эксперты выказалі здагадку, што Сарказі, які выйшаў у другі тур выбараў разам з Аландам (27,08 і 28,63% галасоў адпаведна), магчыма, будзе змагацца за галасы выбаршчыкаў, якія падтрымалі ў першым туры Ле Пэна.

ВЫЛІЧАНЫ НАЙЛЕПШЫ ЎЗРОСТ ЖАНЧЫНЫ

Даследчыкі сцвярджаюць: пасля многіх гадоў эксперыментаў са знешнасцю да 35 гадоў жанчыны звычайна знаходзяць свой стыль, што дорыць ім пачуццё ўпэўненасці ў сабе, піша The Telegraph. Кожная трэцяя жанчына, паводле апытання, з гадамі адчувала сябе ўсё больш камфортна ў дачыненні да сваёй знешнасці. А тры жанчыны з чатырох палічылі, што за доўгія гады яны сталі больш стыльнымі. Кожная 20-я заявіла: да 56 гадоў яна не адчувала сябе максімальна камфортна. Між тым, больш за 50% жанчын, якія ўдзельнічалі ў апытанні, прызналіся: яны адчуваюць пачуццё віны, так як апранаюцца не па ўзросце. Кожная пятая перажывала з нагоды таго, што выглядала, як «авечка, апранутая, быццам ягня».

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

СТАРШЫНЯ ЕЎРАПАРЛАМЕНТА: крах Еўрасаюза — рэальная перспектыва

Старшыня Еўрапарламента немец Марцін Шульц не выключае магчымасці развалу Еўрасаюза як рэгіянальнай супольнасці. Калапс Еўрасаюза ў наш час цалкам рэальны. Такую думку ён выказаў, выступаючы перад членамі заканадаўчага органа, паведамляюць інфармагенцтвы. «Упершыню ў гісторыі Еўрапейскага саюза крах ЕС стаў рэалістычным сцэнарам», — сказаў чыноўнік.

Выступаючы перад калегіяй еўракамісараў 26 красавіка, Шульц звярнуў іх увагу на тое, што ў многіх дзяржавах-членах ЕС склалася складаная сітуацыя: расце ксенафобія, статус еўра як валюты ставіцца пад сумнеў, а адкрытыя ўнутраныя межы Еўропы ў рамках Шэнгенскай зоны знаходзяцца пад пагрозай. У сваім выступленні ён паскардзіўся на пераход рычагоў улады ў ЕС ад грамадскіх інстытутаў і дэмакратычна абранага Еўрапарламента да нацыянальных урадаў.

КОРАТКА

Андрэй Гурцэвіч назначаны камандуючым войскамі Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Адпаведны ўказ № 201 падпісаў 25 красавіка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

З КІМ З ВЯДОМЫХ ЛЮДЗЕЙ ВЫ ХАЦЕЛІ Б ПАЗНАЁМІЦЦА І ЧАМУ?

Святлана СКОРКІНА, цырульнік-мадэльер:

— Паколькі я цікаўлюся фатаграфіяй, хацела б пазнаёміцца з вядомым фатографам Алегам Відзеніным — адным з лепшых сучасных расійскіх фатографаў. Здзіўляе погляд гэтага Майстра на розныя, здавалася б, звычайныя рэчы... І мне хацелася б задаць яму наступнае пытанне: што такое добрая фатаграфія — выпадковасць або вынік старанна прадуманых дзеянняў фатографа?

Наталля ТУРКОВА, спецыяліст групы прапаганды і навучання Лёзненскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях:

— Я — вясёлы і пазітыўны чалавек, паважаю і люблю тых, хто не абдзелены пачуццём гумару. Таму, калі б мне пашчасціла пабываць у «зорнай» кампаніі, вядома ж, гэта былі б Іван Ургант, Міша Галусцян або Вадзік Галыгін. Думаю, што пазітыву ад стасункаў з імі хапіла б надоўга.

Таццяна БАБРОВА, дырэктар віцебскай крамы «Дарыян» Гомельскага ААТ «Камінтэрн»:

— Цікава было б пазнаёміцца з пісьменнікам Уладзімірам Сарокіным. Гісторыя майго знаёмства з яго творчасцю зведала два этапы. Першы, калі па рэкамендацыі бібліятэкара ўзяла прачытаць адзін з яго твораў. Чытала з цікавасцю, але была злёгку шакіраваная. Мабыць, таму твор і запомніўся. Тады і склалася незабыўнае ўражанне пра пісьменніка як пра чалавека своеасаблівага і ў чымсьці адыёзнага. Другі этап звязаны з аднаўленнем цікавасці да творчасці Уладзіміра Сарокіна пасля выпадковага прагляду інтэрв'ю з ім. Я ўбачыла абсалютна супрацьлеглую майму ранейшаму ўяўленню асобу, цікавую і гарманічную, чалавека з глыбокім унутраным светам і выразна выбудаванай сістэмай агульначалавечых каштоўнасцяў, мужа, бацьку дзвюх дачок. Такі дысананс выклікаў у мяне жаданне далейшага знаёмства з яго творчасцю. А калі б была магчымасць пазнаёміцца асабіста з ім, я б гэтым абавязкова скарысталася.

Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НЕ ДАЛЁКАЯ АД НАС ЗЯМЛЯ

Так назваў Казахстан Анатоль РУБІНАЎ падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Казахстан Ергалі БУЛЕГЕНАВЫМ. Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь меў на ўвазе не адлегласць у кіламетрах, якая, між тым, не такая ўжо і вялікая — менш за 2 тысячы кіламетраў, або няпоўныя суткі язды на аўтамабілі ад мяжы да мяжы. Збліжаюць нас з Казахстанам агульныя старонкі гісторыі, але найбольш — дзень сённяшні, Адзіная эканамічная прастора.

— Сёння ў развіцці нашых адносін вялікія перспектывы ва ўсіх сферах, — звярнуўся Анатоль Рубінаў да казахстанскага пасла. — Нам трэба максімальна выкарыстоўваць магчымасці АЭП. З'яўленне побач з Еўрапейскім саюзам у хуткай будучыні Еўразійскага саюза — вельмі моцны фактар, які адпавядае інтарэсам сённяшняй Еўропы. Бо Еўрапейскаму саюзу значна лепш мець надзейнага і моцнага партнёра на кантыненце, чым узаемадзейнічаць з асобнымі разрозненымі краінамі. Насуперак існуючай думцы, кіраваць лягчэй арганізаванай прасторай. І гэтыя два аб'яднанні не павінны супрацьстаяць адно аднаму. У сённяшнім свеце эканоміка ўсіх краін звязана, і сусветны эканамічны крызіс гэта добра паказаў: праблемы ў адных выклікаюць цяжкасці ва ўсіх астатніх. Канкурэнцыя ў сваім былым значэнні страчвае актуальнасць. Цяпер увесь свет — у адной лодцы. І наша з вамі місія — садзейнічаць таму, каб усе складаныя пытанні ў дзейнасці АЭП вырашаліся, усе вузлы развязваліся.

Ергалі Булегенаў пагадзіўся, што адносіны паміж Беларуссю і Казахстанам з 1 студзеня гэтага года набылі зусім новы характар, які мае на ўвазе і вялізную адказнасць, і значную заканадаўчую працу, і новыя кірункі дзейнасці выканаўчай улады. Новы этап адносін яскрава ілюструе дынаміка знешняга гандлю паміж краінамі: толькі за 2 месяцы гэтага года таварааварот узрос на 162% у параўнанні з адпаведным леташнім перыядам, а беларускі экспарт у Казахстан за студзень-люты вырас амаль удвая. Сёння парламенты абедзвюх краін павінны разгледзець 17 базавых пагадненняў АЭП. Яшчэ больш умацаваць адносіны паміж краінамі дазволіць візіт прэзідэнта Казахстана ў Беларусь, які запланаваны на сярэдзіну мая.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

НОВАЕ Ў ДЗЯРЖАЎНАЙ ЖЫЛЛЁВАЙ ПАЛІТЫЦЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Канцэпцыяй прадугледжана, што да 2015 года плошча **арэндага жылля** ў Беларусі можа дасягнуць 2 млн кв. метраў. Пры гэтым, паводле слоў Аляксандра Горваля, да 2015 года плануецца будаўніцтва да 250 тыс. кв. метраў новага арэнднага жылля. Сёлета ў адпаведнасці з прагнозам, будзе пабудавана 46 тыс. кв. метраў.

Як адзначыў А. Горваль, распрацоўваюцца спецыяльныя праекты для будаўніцтва арэнднага жылля, у прыватнасці, невялікіх (ад 18 кв. м) кватэр-студый для маладых сем'яў. Мяркуецца, што стаўкі за арэнду будуць ніжэйшыя за камерцыйныя і можна будзе заключаць кантракт на арэнду на пяць гадоў і падаўжаць яго да канца жыцця.

Прадастаўляць арэнднае жыллё будуць усім у парадку чаргі, але перш за ўсё тым, хто не забяспечаны па нормах жылплошчай (нагадаем, для Мінска гэта менш за 10 квадратных метраў на чалавека, у іншых гарадах — 15 метраў). Што тычыцца спосабу размеркавання і выдзялення арэнднага жылля насельніцтву, то, як паведаміў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Аляксандр Аўраменка, інфармацыя аб арэндных кватэрах будзе размяшчацца на сайце мясцовага камітэта і на працягу двух тыдняў усе ахвотныя сярод тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, змогуць пакідаць заяўку на засяленне. Права пражывць у такім жыллі будзе ў першую чаргу ў тых, хто па часе даўжэй за іншых знаходзіцца на ўліку.

Акрамя таго, згодна з праектам Канцэпцыі, плануецца значна **развіваць будаўніцтва жылля ў сельскай мясцовасці.**

Святлана БУСЬКО.

АБЗАЦ

◢ 76% тэрыторыі Беларусі з'яўляюцца неспрыяльнымі па клешчавым энцэфаліце, 92% — па Лайм-барэліёзе. Пра гэта паведаміла ўчора журналістам урач-энтамолаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана Яшкова.

◢ **Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі адкрые сезон 29 красавіка. У гэты дзень пройдуць лекцыі для наведнікаў па добраўпарадкаванні дачы і саду. Так, з 10 да 11.30 у канферэнц-зале аранжарэі можна будзе даведацца пра агратэхніку вырошчвання і новыя гатункі гладыёлусаў і вяргінь, з 12 да 13.30 — аб дэкаратыўнай стрыжцы кустоўя і дрэў. У 14 гадзін можна паслухаць пра ландшафтны дызайн прысядзібных участкаў. Пройдзе і выстаўка-продаж папулярных відаў архідэй.**

◢ У Віцебскай вобласці летась 92,7% маладых медыкаў засталіся працаваць на першых працоўных месцах. Жыллём былі забяспечаны 155 маладых урачоў і 195 сяродніх медыцынскіх работнікаў. Сёлета маладым спецыялістам таксама будзе прадастаўлена каля 100 кватэр. Пра гэта ўчора на пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама паведаміў начальнік упраўлення аховы здароўя аблвыканкама Юрый Дзяркач.

ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ **У Літве пачалася сацыяльная акцыя паліцэйскіх — на іх аўтамабілях будзе налеплены надпіс «Я хабару не бяру». Кіраўніцтва паліцыі спадзяецца, што такая налепка адаб'е ў парушальнікаў Правілаў дарожнага руху жаданне даць хабар паліцэйскаму. У канцы года тыя з вартавых парадку на дарогах, хто зафіксуе найбольшую колькасць спроб подкупу, будуць узнагароджаны істотнымі сумамі. Па звестках генеральнага камісарыяту паліцыі, летась было заведзена 370 спраў за спробу подкупу службовых асоб, а сёлета за 3 месяцы — 170 такіх выпадкаў. Летась заведзена 29 спраў аб магчымай карупцыі паліцэйскіх.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Уважаемые акционеры

Совместного открытого акционерного общества «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум — наша косметика», 14 мая 2012 года в 17.00 в административно-хозяйственном здании СОАО «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум — наша косметика», расположенном по адресу: г. Минск, улица Володько, 6, состоится внеочередное собрание акционеров.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О реорганизации СОАО «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум — наша косметика» в форме выделения и передаче выделяемому юридическому лицу имущества.

2. О выкупе Обществом акций Общества по требованию его акционеров, определении цены выкупа Обществом акций Общества и общей суммы денежных средств, направляемых Обществом на выкуп акций.

3. Об утверждении списка акционеров, акции которых должны быть выкуплены Обществом по требованию акционеров, и уведомлении акционеров об их праве потребовать выкуп акций.

4. О проведении инвентаризации имущества и имущественных обязательств Общества.

5. Об уведомлении кредиторов Общества о его реорганизации.

6. О согласовании наименования выделяемого юридического лица и назначении лица, ответственного за организацию его согласования в государственных органах.

7. Об определении местонахождения выделяемого юридического лица.

8. Об определении размера уставного фонда выделяемого юридического лица, размера долей и вкладов участников, порядка их внесения в уставный фонд.

9. О подготовке проекта Устава выделяемого юридического лица.

10. О порядке созыва и проведения общего собрания участников выделяемого юридического лица.

Лица, имеющие право на участие в Собрании, могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня предстоящего Собрания по адресу: город Минск, ул. Володько, 6. Контактное лицо — директор Общества Скуратович И.В.

Начало регистрации акционеров в 16.30.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на «07» мая 2012 года.

При себе иметь документы, удостоверяющие личность и полномочия.

Наблюдательный совет СОАО «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум — наша косметика». *УНП 100092830*

Утерянные (украденные) бланки строгой отчетности 1СУ «Квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов)» серии КВ с № 1996965 в количестве 1 шт., «Добровольное страхование имущества» серии БИ с № 8822721 по № 8822725 в количестве 5 шт., «Обязательное страхование гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь» серии ВС с № 7538518 по № 7538520 в количестве 5 шт. и с № 7590751 по № 7590770 в количестве 20 шт., «Договор страхования, заключаемый с юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем по страхованию иному, чем страхование жизни» серии ВВ с № 68917 по № 68918 в количестве 2 шт. Представительства Белгосстраха по Минскому району считать недействительным.

УНП 600013344

«У ЕЎРАСАЮЗЕ ЗРАЗУМЕЛІ БЕСПЕРСПЕКТЫЎНАСЦЬ САНКЦЫЙ У АДНОСІНАХ ДА БЕЛАРУСІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пытанне будаўніцтва другой АЭС у Беларусі пакуль неактуальнае, заявіў Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанні журналістаў.

«Гэта пытанне неактуальнае пакуль, — сказаў Прэзідэнт. — Але пакуль мы яшчэ прыкідваем, думаем, глядзім».

«Я паўжартам сказаў, што нядрэнна было б, каб вы нам дапамаглі тэхналогіямі пабудаваць другую АЭС. Калі б на ўмовах, як Расія ў нас будуе гэту станцыю, была б пабудавана яшчэ адна атамная станцыя на другой пляцоўцы (вы ведаеце, яна гатова і даследавана — у Магілёўскай вобласці), мы былі б значна багацейшымі, таму што мелі б поўную энергетычную бяспеку, знікла б залежнасць па электраэнергіі», — сказаў кіраўнік дзяржавы, успамінаючы сваю сустрэчу ў Мінску з генеральным дырэктарам МАГАТЭ.

«Але калі знойдзецца інвестар на такіх умовах, як Расія ў нас будуе атамную электрастанцыю, я быў бы рады. Можа, японцы, карэйцы, французы з немцамі, амерыканцы... Пажывём — пабачым. Але хацелася б, вядома», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«У нас быў генеральны дырэктар МАГАТЭ, і спецыялісты агенцтва прысутнічаюць пастаянна, яны маніторацъ сітуацыю і да нас не маюць пытанняў па тэхналогіях будаўніцтва і бяспекі станцыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы бяром самыя перадавыя тэхналогіі ў расіян, такіх станцый ужо нямала пабудавана па ўсім свеце Расіяй. Гэта самы высокі ўзровень абароненасці і бяспекі станцыі», — адзначыў Прэзідэнт. Ён дадаў, што будаўніцтва АЭС ужо вядзецца. «Таму атамнай станцыі ў Беларусі быць, і мы яе пабудуем, хто б ні крычаў, па міжнародных стандартах», — сказаў Прэзідэнт.

«Палітыка вызначана, і я дакладна прытрымліваюся гэтай палітыкі. Мы тут гаспадары на гэтай зямлі і мы будзем вызначаць, дзе будаваць і што будаваць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка, каментуючы выказванні аб тым, што нейкія еўрапейскія сілы могуць прымусіць Беларусь прыпыніць будаўніцтва АЭС. «Наконт нейкіх еўрапейскіх сіл, якія спрабуюць нас нахіліць не першы год і прымусіць нас рабіць так, як яны хочуць, а не так, як мы хочам жыць, вы ўжо ведаеце аб гэтых выніках», — адзначыў беларускі лідар.

«Літоўцы крычаць, што яны таксама на тым жа месцы хочуць пабудаваць сваю атамную станцыю. На такой жа адлегласці ад нашай граніцы», — сказаў Прэзідэнт. «Дарэчы, тая станцыя, якую яны быццам бы закрылі і вывелі, яшчэ пыхкае там. Яна пабудавана ўвогуле на нашай граніцы. І ваду яны бяруць з нашых азёр. Чаму тады не крычалі, скідваючы нам бруд у гэтыя азёры? Што гэта станцыя была небяспечная, яны самі ў гэтым распісаліся, закрыўшы яе па патрабаванні сваіх кампаньёнаў», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Беларусь і Расія знялі ўсе вострыя эканамічныя і грамадска-палітычныя пытанні, заявіў Прэзідэнт.

«Мы стварылі Адзіную эканамічную прастору, дзе ўсе роўныя, ужо няма гэтых войнаў, ні малочных, ні іншых. Мы маем вялікі рынак: каля 170 млн чалавек, перш за ўсё за кошт Расіі, гэта значыць зняты ўсе эканамічныя і грамадска-палітычныя пытанні, якія былі ў нас з Расіяй», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь і Расія будуць супрацоўнічаць па ўсіх напрамках. Гэта датычыцца і супрацоўніцтва ў ваенна-тэхнічнай сферы. «Закрытых тэм у нас няма ў ваенна-тэхнічнай галіне, у абароне нашых граніц, і мы з расіянамі будзем выбудоўваць агульную абаронную палітыку, стратэгію, тактыку і на практыцы будзем гэта ажыццяўляць», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што калі існавалі праблемныя пытанні ў эканамічным супрацоўніцтве Беларусі і Расіі, абмяркоўваўся і напрамак абароны агульнай прасторы. «Помніце, калі нам за 5 гадоў чатыры разы павысілі цэны на газ, калі яны былі такімі, як у Германіі, а то і вышэй, помніце, як з нафтай нам цяжка было, мы ў Венесуэлу ездзілі? Але паралельна ішлі кантакты з Расіяй у АДКБ. І там заўсёды абмяркоўвалася пытанне, як мы будзем абараняць нашу агульную прастору», — сказаў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што ў Саюзнай дзяржаве ў Беларусі і Расіі сумесная групоўка на заходнім напрамку. Паводле яго слоў, пытанне сумесных дзеянняў і абароны тут таксама абмяркоўвалася. «Тады я і публічна гэта гаварыў, і Пуціну, і Мядзведзеву: так, мы гатовы і сумесную ППА зрабіць, мы да ўсяго гатовы. Але я павінен сваім людзям растлумачыць, што ж мы будзем абараняць, калі Расія, брацкая, блізкая краіна, прадае нам па такіх цэнах тое, у чым мы маем патрэбу? Навошта нам сёння напружвацца, калі мы можам гандляваць і так?» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, цяпер сітуацыя змянілася. «Паглядзіце, што адбылося цяпер. Цэны мы маем прыкладна $165-170 на газ, такіх цэн у свеце практычна няма ў Расіі з іншымі дзяржавамі. Бяспошлінная пастаўка нафты, калі нафта каштуе сёння на рынках, дапусцім, $800, то мы маем магчымасць атрымліваць па $400-450», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што ў той час ён адразу падпісаў указ аб стварэнні адзінай групоўкі проціпаветранай абароны. «Гэта вельмі цікавіла расіян, і гэта вельмі важна», — дадаў Прэзідэнт.

Беларусь пайшла на супрацоўніцтва і ў іншых сферах, асабліва актывізаваўшы адносіны ў плане сумеснай беларуска-расійскай групоўкі войскаў. Сёння Расія цалкам аснашчае беларускія сілы хуткага рэагавання ўзбраеннем і абмундзіраваннем. Беларусь за паўцаны атрымлівае ўзбраенне з Расіі. «Інакш кажучы, ужо ёсць што абараняць», — адзначыў Прэзідэнт.

«Расія многія пытанні вырашыла, і гэта не адзін мільярд далараў, — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. — Расія прыняла нашы ўмовы — мы прымаем іх умовы. Таму такіх наогул няма напрамкаў, дзе мы не можам супрацоўнічаць».

Мадэрнізацыя і стварэнне сучасных высокаэфектыўных вытворчасцяў дасць магчымасць вырашыць праблему замацавання спецыялістаў у чарнобыльскіх рэгіёнах.

«Каб замацаваць спецыялістаў у чарнобыльскіх рэгіёнах, патрэбны такія сучасныя прадпрыемствы, як Быхаўскі кансервава-агародніна-насушыльны завод», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Прадукцыя гэтага прадпрыемства пастаўляецца ў многія краіны свету, у тым ліку ў ЗША. Працаваць на такім заводзе імкнуцца многія мясцовыя жыхары. «Будуць у нас такія прадпрыемствы — пытанне кадраў закрыецца раз і назаўсёды», — сказаў Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што яшчэ тры гады таму губернатары ўзнімалі пытанне недахопу настаўнікаў, медыкаў. Цяпер гэта праблема практычна знята. Прэзідэнт лічыць, што спецыялістам, якія прыязджаюць на работу, трэба ўсякім чынам дапамагаць, у тым ліку з жыллём.

У Беларусі зарплаты будуць павышацца з ростам прадукцыйнасці працы.

«Будзеце вырабляць больш прадукцыі — будзеце больш прадаваць, будзе больш грошай, а значыць і большая зарплата. Ніхто незарабленых грошай нікому не дасць, гавару вам адкрыта. Друкаваць грошы мы не будзем для таго, каб плаціць зарплату», — адзначыў Прэзідэнт. На яго думку, «трэба самім прыкладаць намаганні і думаць, як зарабляць». А калі спатрэбіцца дапамога дзяржавы — дапаможам, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Тлумачачы, чаму ён прыехаў менавіта ў Быхаўскі раён, Прэзідэнт сказаў, што хацеў паглядзець, як жывуць тут людзі, як адраджаецца вытворчасць. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пераканаўся ў эфектыўнасці адраджаемых змель. «Я вельмі рады, што мы адрадзілі гэты выдатны куток і паціху пераадольваем гэты чарнобыльскі сіндром», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

У Беларусі, Казахстана і Расіі няма сістэмных супярэчнасцяў па фарміраванні Еўразійскага эканамічнага саюза.

«Ніякіх сістэмных супярэчнасцяў у гэтым няма. Карысць у тым, што ў 2015 годзе дакладна будзе Еўразійскі саюз», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што Беларусь і Расія выступаюць з адзіных пазіцый па пытаннях стварэння саюза. «Адзінае, мы гаворым аб тым, што тое, што датычыцца нашых суверэнных правоў як дзяржаў, і тое, што мы можам вырашаць самі, Расія і Беларусь, мы не павінны заганяць у гэту агульную бочку. Мы не павінны ўсе пытанні суверэнітэту аддаваць пакуль яшчэ, можна сказаць, вельмі слабаму наднацыянальнаму органу — Еўразійскай камісіі. Мы самі можам пакуль вырашаць пытанні, узгадняючы іх з Расіяй, Казахстанам», — лічыць беларускі лідар. Ён расказаў, што ў гэтым плане былі сур'ёзныя пярэчанні Казахстана. «Не важна тое, што Казахстан сказаў: да 2015 года мы дакладна падпішам гэты дагавор. Раней такога не было. Таму ў 2015 годзе дакладна будзе Еўразійскі саюз», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Сістэмных супярэчнасцяў няма, ёсць толькі вызначаныя часовыя рамкі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэтыя пытанні плануе абмеркаваць з Прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым у час яго візіту ў бліжэйшы час у Беларусь. Прэзідэнт Беларусі расказаў, што лідары дзвюх краін маюць намер пракантраляваць, як рэалізуюцца двухбаковыя дамоўленасці. Паводле яго слоў, Беларусь удзельнічае прыкладна ў 30 з 35 казахстанскіх праграм мадэрнізацыі. Беларусь пастаўляе ў гэту краіну не толькі тэхніку, але і мае намер прымаць удзел у праектах па развіцці сельскай гаспадаркі. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, беларускі вопыт вельмі цікавы Казахстану. «Мы гатовы будаваць аграгарадкі, пастаўляць тэхніку, вяртаць у севазварот землі: мы многае гатовы рабіць і дзяліцца вопытам са сваімі казахскімі сябрамі, як працаваць на зямлі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Беларусь прадоўжыць актыўнае развіццё чарнобыльскіх рэгіёнаў.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што яму ў свой час даводзілася прымаць рашэнні па пераарыентацыі сродкаў па чарнобыльскіх праграмах. Тады было вырашана накіроўваць сродкі на адраджэнне чарнобыльскіх рэгіёнаў. Практыка паказала правільнасць і эфектыўнасць прынятага рашэння. «З той пары мы зрабілі нямала ў Беларусі — мы пачалі адраджаць чарнобыльскія землі. І сёння мясцовыя жыхары пацвярджаюць, што гэта было правільнае рашэнне. Мы сабралі ўсе грошы, якія ішлі па чарнобыльскай праграме, і кінулі іх на адраджэнне зямель, у развіццё вытворчасці. За кошт акумуляваных сродкаў мы пачалі ствараць новыя прадпрыемствы, будаваць станцыі па ачыстцы вады ад прымесяў жалеза, дарогі, газіфікавалі рэгіёны. І, як бачыце, мы атрымалі добры вынік», — сказаў кіраўнік дзяржавы. І сёння аб так званым чарнобыльскім Быхаўскім раёне не скажаш, што гэта горшы раён, якім ён быў яшчэ 5-7 гадоў таму. Гэта ўжо раён высокага ўзроўню. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дзякуючы рэалізацыі чарнобыльскай праграмы ўдалося ўзняць на належны ўзровень і іншыя раёны Магілёўскай вобласці.

«Мы нямала зрабілі апошнім часам і я не шкадую часу і грошай, якія мы затрацілі на рэабілітацыю і аднаўленне чарнобыльскіх земляў. Мы ў гэтым напрамку будзем дзейнічаць і далей», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Гаворачы аб праблеме кадраў у рэгіёне, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што яна ў асноўным вырашана або вырашаецца. «Няма катастрофы, трэба спакойна жыць і працаваць і думаць аб будучым», — рэзюмаваў ён.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ЕДЗЕШ НА ВАКЗАЛ? УДАКЛАДНІ РАСКЛАД

Дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» праінфармавала, як будуць выконвацца рэгулярныя рэйсы па міжгародніх маршрутах у бліжэйшы час. Так, у перыяд з 27 красавіка па 1 мая тыя з іх, якія абслугоўваюцца названым прадпрыемствам, будуць ажыццяўляцца: 27 красавіка — па раскладзе буднага дня (чацвярга), 28 красавіка — па графіку пятніцы. 29 красавіка рэйсы будуць выконвацца па графіку суботніх дзён, 30 красавіка і 1 мая — нядзельных.

СЕЗОН ЗАКАНЧВАЕЦЦА, СЕЗОН... СТАРТУЕ

З 1 мая ў краіне, згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, распачнецца сезон палявання на дзіка — дарослых самцоў, маладняк да двух гадоў любога полу.

Доўжыцца ён будзе па 30 верасня з 18 да 9 гадзін. Спосаб палявання — зброевы з засады, з падыходу. 30 красавіка заканчваецца сезон здабычы тых жа жывёл, які дазваляўся зброевым спосабам з засады з вышкі з 1 студзеня на працягу сутак. З 15 мая па 30 верасня з 18 да 9 гадзін можна будзе здабываць еўрапейскую казулю. Паляваць зброевым спосабам з засады, з падыходу, з вабікам можна будзе на дарослых самцоў, селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У ВЫБУХУ — «НЕЛЕГАЛЬНЫ» СЛЕД

19 красавіка ў гандлёвай зале аднаго з магазінаў Гомеля ў 13.58 была прыведзена ў дзеянне самаробная прылада. Аператыўныя даныя і элементы прылады сталі падставай для адпрацоўкі версіі аб «разборы» паміж арганізатарамі каналаў нелегальнай міграцыі з ліку замежнікаў, якія прыехалі нібыта для навучання ў гомельскіх ВНУ.

Па выніках аналізу запісаў відэакамер назірання, тэлефонных злучэнняў і іншых даных следчымі і аператыўнымі падраздзяленнямі арганізаваны вышук дзвюх асоб ва ўзросце 25-35 гадоў. Адзін — каранастага целаскладу, з кароткай барадой і прыкметным шрамам на твары.

Як паведамляюць ва ўпраўленні КДБ па Гомельскай вобласці, следства вывучае прадастаўленыя ананімна звесткі аб узаемасувязі згаданых асоб з падзеямі, якія мелі месца ў Адэсе. На ўкраінскай тэрыторыі актывізавалася дзейнасць арганізатараў каналаў нелегальнай міграцыі з краін з тэрарыстычнай актыўнасцю. Па афіцыйных звестках Украіны, толькі ў першым квартале гэтага года затрымана 390 нелегальных мігрантаў, канфіскавана 181 адзінка зброі, звыш 6 тысяч боепрыпасаў і амаль 6 кг выбуховых рэчываў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ТЭРОР ЦІ НЕАСЦЯРОЖНАСЦЬ?

Вечарам 25 красавіка ў Кобрыне ў выніку выбуху гранаты загінулі два чалавекі — мужчына 1957 года нараджэння і яго сын 1979 года нараджэння. На месца здарэння выязджала аператыўна-следчая група з ліку супрацоўнікаў УКДБ па Брэсцкай вобласці, УСК Брэсцкай вобласці, УУС Брэсцкага аблвыканкама, абласнога УМНС, а таксама спецыялісты сапёрна-піратэхнічнай групы в/ч 5526 (Брэст), паведамілі БЕЛТА ў прэс-групе ўпраўлення КДБ Беларусі па Брэсцкай вобласці.

У якасці адной з версій здарэння УКДБ вывучаецца наяўнасць тэрарыстычнага следу: бацька раней прыцягваўся да крымінальнай адказнасці, сын доўгі час знаходзіўся ў Паўночна-каўказскім рэгіёне Расійскай Федэрацыі і вярнуўся ў Кобрын за два дні да гібелі. «Навакольныя адзначаюць наяўнасць фінансавых цяжкасцяў у сям'і загінулых, што магло стаць прычынай для спробы арганізацыі нелегальнага збыту сродкаў паражэння, у тым ліку ў інтарэсах канкрэтных заказчыкаў з ліку нелегальных мігрантаў», — расказалі ва УКДБ.

Кар. БЕЛТА.

КРЫЖА НА ІХ НЯМА

На Радаўніцу на тэрыторыі Мінскай вобласці каля 930 тысяч чалавек, паводле звестак прэс-службы УУС Мінаблвыканкама, бралі ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных памінанню нябожчыкаў. Менавіта ў гэты дзень у міліцыю звярнуліся дзве мінчанкі з заявамі, што невядомыя з магіл іх родных на могілках паблізу вёскі Бальшавік Мінскага раёна ўкралі з надмагільных пліт тры бронзавыя медальёны. У першым выпадку жанчына ўказала тыднёвы тэрмін напярэдадні Радаўніцы, калі зламыснікі маглі зрабіць сваю чорную справу. А вось у другім выпадку мінчанка не наведвала могілкі ажно з лістапада мінулага года... Па гэтых фактах злачынства заведзена крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «Белспецконтракт» 31 мая 2012 года проводит 9-ый открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности.

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км, наработка в м/ч	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
93	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А8341353 на МАЗ-5334 ш. 55575 дв. 656319 4 кат.	н.п. Михановичи в/ч 52188	1983	46 446 км 993 м/ч	56 000 000	5 600 000
94	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А8341389 на МАЗ-5334 ш. 55373 дв. 653793 4 кат.	н.п. Михановичи в/ч 52188	1983	18 908 км 470 м/ч	67 000 000	6 700 000
95	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А8310131 на МАЗ-5334 ш. 47096 дв. 641837 4 кат.	н.п. Михановичи в/ч 52188	1983	43 427 км 3 221 м/ч	65 000 000	6 500 000
96	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А8320654 на МАЗ-5334 ш. 51151 дв. 641599 4 кат.	н.п. Михановичи в/ч 52188	1983	78 202 км 635 м/ч	50 000 000	5 000 000
97	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А8331145 на МАЗ-5334 ш. 54267 дв. 652021 4 кат.	н.п. Михановичи в/ч 52188	1983	2 138 км 20 м/ч	76 000 000	7 600 000
98	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А8330932 на МАЗ-5334 ш. 52202 дв. 645149 4 кат.	н.п. Михановичи в/ч 52188	1983	23 505 км 319 м/ч	67 000 000	6 700 000
99	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А9010476 на МАЗ-5334 ш. 122696 дв. 784404 4 кат.	н.п. Михановичи в/ч 52188	1990	93 059 км 1 366 м/ч	89 000 000	8 900 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, каб. № 637 **31 мая 2012 г.** в 11.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 28 мая 2012 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **31 мая 2012 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС.** **Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс (017) 278 09 98. Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.by.**

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «Белспецконтракт» 17 мая 2012 года проводит 2-й повторный открытый аукцион от 28 января 2011 года по продаже имущества республиканской собственности на 8-ом открытом аукционе.

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
4/11	Самолет Ан-24Б № 99902203, дв. Аи-24 с. 2 № Н4912105, дв. Аи-24 с. 2 № Н4012035, дв. ТГ-16 № АТ945005, 5 402 посадки, 3 КВР-1994 г.	г.п. Мачулищи в/ч 06752	1969	5 118	1 412 000 000	141 200 000
6/11	Вертолет Ми-26 № 34001212131, дв. Д-136 № 2251364001063, дв. Д-136 № 2251364001064, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 722А8В017	г.п. Мачулищи в/ч 06752	1987	594	10 440 000 000	1 044 000 000
7/11	Вертолет Ми-26 № 34001212104, дв. Д-136 № 2251364001067, дв. Д-136 № 2251364001068, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 622А8В006	г.п. Мачулищи в/ч 06752	1986	593	9 637 000 000	963 700 000
8/11	Вертолет Ми-26 № 34001212018, КАУ-140 № 82110014030, КАУ-140 № 82110140032, КАУ-140 № 821110140041, КАУ-140-01 № 821033010004, дв. ТА-8В № 042А8В058, 1 КВР-1990 г.	г.п. Мачулищи в/ч 06752	1983	1 774	5 622 000 000	562 200 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, каб. № 637 17 мая 2012 г. в 11.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 14 мая 2012 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **17 мая 2012 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **10-ти** календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС.** **Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс (017) 278 09 98. Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.by.**

■ Погляд палітолага

СУД НАД БРЭЙВІКАМ: ТЭАТР АБСУРДУ АБО ВЫПРАБАВАННЕ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ ПРЫНЦЫПАЎ?

17 красавіка абвінавачванаму ў забойстве 77 суграмадзян Андэрсу Берынгу Брэйвіку далі магчымасць выступіць з доўгай прамовай у сваю абарону, якая стала больш палітычнай заявай, чым судовай прамовай. Яе змест тут жа патрапіў у інтэрнэт і стаў тэмай для абмеркавання дзясяткамі мільёнаў грамадзян — як Еўрасаюза, так і іншых краін. З асноўных палажэнняў выступа выразна відаць, што спекуляцыі аб стане бессвядомасці Брэйвіка не больш чым спроба не дапусціць магчымасці падобнай прамовы і яе грамадскага абмеркавання. Спроба правалілася. З прамовы можна зразумець, што Брэйвік цалкам пры свядомасці, цудоўна ведае асаблівасці судовай сістэмы сваёй краіны, заканамернасці функцыянавання глабальных сродкаў масавай інфармацыі і звярнуўся да масавага забойства людзей як да сродку прыцягнення ўвагі і раскруткі сваіх палітычных перакананняў.

У кожным яго ўчынку прасочваецца відав

ПАНЯДЗЕЛАК, 30 КРАСАВІКА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.10, 7.35, 8.15, 8.35 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.50** Навіны.
7.05, 8.05, 18.45, 0.05 Зона Х.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
9.10 У цэнтры ўвагі.
10.05 Клуб рэдактараў.
10.45 «Зямля беларуская». «Іванаўская купель».
11.00 «Музыка беларускага кіно».
12.10 Серыял «Маргоша».
14.00 «Сваты. Жыццё без грыму».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 М/ф.
15.35, 0.30 Камедыя «Аднойчы ў Вегасе».
17.15 Серыял «Маруся».
18.15 Арэна.
19.40 «Калыханка».
19.55 Серыял «Калі яго зусім не чакаеш...».
21.00 Панарама.
21.45 Форум.
22.45 Дзённік «Еўрабачання».
22.55 Серыял «Падмані мяне».
0.15 Дзень спорту.

АНТ

6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00 (з субцітрамі), **18.00, 20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.05 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 Серыял «Бедная Насця».
12.00 Серыял «Два колеры страсці». Заключная серыя.
13.10 «Крымінальныя хронікі».
13.40 Кантрольная закупка.
14.10 «Модны прыгавор».
15.10 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
16.15 «Адваротны адлік». «Беларускі Робін Гуд. Герой або разбойнік?».
17.00 «Філіп Кіркораў». «Я сабе прыдумаў гэта жыццё».
18.20 Камедыя «Сабака Барбос і незвычайны крос».
18.30 Камедыя «Пяць нявест».
21.05 ДО РЭ: Філіп Кіркораў.
23.15 Маст. фільм «У дарозе».
0.55 Начныя навіны.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 20.10 Тэлебарометр.
9.05 Кінапробы.
9.40 Навіны надвор'я.
10.10, 17.55 Серыял «Усё золата свету...».
11.15 Школа рамонту.
12.20 Бітва экстрасэнсаў.
13.25 Камедыя «Цырк».
15.20 Кінааповесць «Балада пра салдата».
16.55, 0.55 Дэтэктыў «Выратуйце нашы душы».
18.55 Пад грыфам «Вядомыя».
19.30 «Халі-галі». Скетч-шоу.
20.15 Беларуская часінка.
21.25 КЕНО.
21.35 Авертайм.
22.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Манчэстэр Юнайтэд».
0.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.35 «Вялікае снеданне».
10.10 «Зялёны агурок. Карысная перадача».
10.40, 17.10 Званая вячэра.
11.25 «Вялікі горад».
12.00, 13.50 Камедыя «12 крэслаў».
15.15 «Зорны рынг». Наталля Тамела супраць групы «Чырвоныя зоркі».
16.50 «Наша справа».
17.00 «Міншчына».
17.45 Камедыя «Суперцешча для няўдачніка».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Добры вечар, малы.
20.40 Маст. фільм «Бацька».
23.00 «Прафесійны бокс».
0.00 «Тайны свету».
0.50 «Пякельная кухня».

МІР

5.00 М/ф: «Новыя прыгоды папугая Кешы», «Раніца папугая Кешы», «Малы і Карлсан», «Карлсан вярнуўся», «Тайна трэцяй планеты».
7.00 Маст. фільм «Волга-Волга».
9.00, 15.00, 18.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 Маст. фільм «Шалёны дзень».
10.25 Маст. фільм «Кубанскія казакі».
12.25 Маст. фільм «Зялёны фургон».
15.15, 18.15 Серыял «Застава Жыліна».
20.55 Маст. фільм «Гатэль «Мільён дараў».
23.15 «Простыя лічбы».
23.40 Маст. фільм «Узаранная цаліна».

8 КАНАЛ

7.00, 10.10, 14.35, 18.55, 21.00, 23.40 «Надвор'е».
7.05 «На рыбалку».
7.20, 14.40 Серыял «Чорная лагуна».
8.50, 23.20 «Кінаблакнот».
9.10, 18.00 Серыял «Першабытнае».
